**Пытанні і заданні**

1. Чаму ў расійскай гісторыі перыяд з 1725 па 1762 г. атрымаў назву «эпохі палацавых пераваротаў»?
2. У чым палітыка Кацярыны была працягам палітыкі Пятра І?
3. Як у час праўлення Кацярыны ІІ змянілася становішча дваран? Як змянілася становішча сялян?
4. Складзіце расказ пра сялянскае паўстанне 1773–1775 гг. па наступным плане: а) прычыны паўстання; б) правадыр паўстання і асноўныя ўдзельнікі; в) тэрыторыя пашырэння паўстання; г) вынік паўстання. Пры адказе выкарыстайце картасхему на с. 175.
5. Складзіце ў сшытку схему «Асноўныя кірункі знешняй палітыкі Кацярыны ІІ».

# § 26. Руская культура XVI–XVIII стст.

**1 сакавіка 1564 г.** — **1687 г.** — **1724 г.** — **1755 г.**

**Успомніце.** *Якія змены ў культурным жыцці Заходняй Еўропы адбыліся пад уплывам ідэй Адраджэння і Асветніцтва?*

Утварэнне адзінай Расійскай дзяржавы аказала велізарны ўплыў на развіццё культуры. Рост велічы і магутнасці дзяржавы адлюстраваўся ў творах дойлідства, жывапісу і літаратуры.

**Вы даведаецеся.** *Якія змены адбыліся ў рускай культуры ў XVI–XVIII стст. Чым гэтыя змены былі выкліканы.*

**1. Вусная народная творчасць.** Змаганне са знешнімі ворагамі і фарміраванне адзінай Расійскай дзяржавы знайшлі адлюстраванне ў народнай творчасці (фальклоры). Адным з улюбёных герояў рускіх былін зрабіўся Сцяпан Разін.

Шмат гістарычных песень было складзена пра Івана IV. Лютага цара ўслаўлялі за барацьбу са знешнімі ворагамі і асуджалі за жорсткасць і крывапраліцце.

Народ з'едліва і кпліва высмейваў баяр і памешчыкаў, царкоўнікаў і багатых купцоў. Пра гэта сведчаць шматлікія прыказкі і прымаўкі: «Пакараў Бог народ — прыслаў ваявод», «А багаты і на золата слёзы лье».



Помнік Івану Фёдараву ў Маскве. Скульптар *Сяргей Валнухін*. 1909 г.

Па гарадах і вёсках хадзілі вандроўныя артысты — скамарохі, гусляры-песеннікі, павадыры з мядзведзямі. Вялікую папулярнасць мелі лялечныя прадстаўленні з удзелам Пятрушкі.

**2. Развіццё кнігадрукавання.** Рукапісныя кнігі былі ў той час вельмі дарагія, таму ўпадабаныя творы часта перапісваліся ад рукі і перадаваліся ў спадчыну. Найважнейшай падзеяй XVI ст. стала з'яўленне рускага кнігадрукавання. ***1 сакавіка 1564 г. Іван Фёдараў*** і яго паплечнік беларускі майстар Пётр Мсціславец выдалі рэлігійную кнігу «Апостал». Гэта была першая руская друкаваная кніга, у якой пазначаліся дата і месца выдання, а таксама імёны першадрукароў.

Асаблівае месца ў культуры XVI ст. займае бібліятэка Івана Грознага. Цар Іван паказваў яе аднаму вучонаму святару, і таго ашаламіла багацце збору кніг. Па сведчанні гэтага чалавека, у бібліятэцы былі творы вядомых і невядомых аўтараў.
Пытанне пра лёс унікальнай бібліятэкі дагэтуль выклікае бурныя спрэчкі сярод навукоўцаў. У яе існаванні ніхто не сумняваецца. Але што адбылося з ёю далей — ці яна згарэла падчас пажараў у Маскве, ці яе замураваў Іван Грозны ў падземным кнігасховішчы, застаецца невядомым.

222—226

**3. Развіццё літаратуры.** Руская літаратура XVI ст. у асноўным мела рэлігійны характар. У XVII ст. адбыўся пераход ад рэлігійнай тэматыкі да свецкай. З'явіліся сатырычныя аповесці. Вялікай папулярнасцю карысталася «Аповесць пра Ярша Яршовіча». У ёй злосна высмейваліся «вялікі баярын і ваявода» Асётр, дваранін Лешч і багацей Сом.



Першая дакладна датаваная друкаваная кніга ў Расіі «Апостал». 1564 г.

У рускай літаратуры XVIII ст. асноўным мастацкім стылем быў класіцызм. Прыкметнаю з'явай таго часу стала камедыя Дзяніса Фанвізіна «Недаростак». Галоўны герой камедыі Мітрафанушка жыве гультаём у маёнтку сваёй маці, не жадае вучыцца і займацца хоць якой справай. Матуля аберагае свайго сыночка ад усялякіх клопатаў: «высакароднаму» не трэба ведаць геаграфію — рамізнік куды хочаш давязе.

Асаблівае месца ў літаратуры і грамадскай думцы XVIII ст. належыць Аляксандру Радзішчаву. У 1790 г. ён напісаў свой самы знакаміты твор «Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву». Галоўная тэма кнігі — становішча простага люду. Асноўнае зло, на думку асветніка, — прыгоннае права, якое выракае народ на галечу і невуцтва. «Звяры прагныя, п'явіцы ненажэрныя, што селяніну мы пакідаем? Тое, чаго адабраць не можам, — паветра», — такі яго зварот да дваран-прыгоннікаў. Уважлівай чытачкай «Падарожжа» выявілася Кацярына II. Яна назвала пісьменніка «бунтаром, горшым за Пугачова», кнігу прыгаварыла да спалення, а пісьменніка саслала ў Сібір.



Аляксандр Радзішчаў. *Невядомы мастак.* 1790 г.

**4. Развіццё адукацыі і навукі.** Характэрнай рысай XVII ст. стаў рост пісьменнасці сярод розных пластоў насельніцтва. Грамаце навучалі ў сям'і або дома з настаўнікам за плату. Аднак нават у багатых дамах жанчыны звычайна заставаліся непісьменнымі.

246—248

У 1640-х гг. з'явіліся сярэднія школы. У 1687 г. у Маскве адкрылася першая вышэйшая навучальная ўстанова — Славяна-грэка-лацінская акадэмія, якая рыхтавала кадры для дзяржаўных і царкоўных устаноў. Ідэя яе стварэння належала ўраджэнцу беларускіх зямель Сімяону Полацкаму. У 1724 г. у Санкт-Пецярбургу была заснаваная Акадэмія навук, для працы ў якой запрашалі навукоўцаў з Еўропы. Цягам XVIII ст. вучоныя Акадэміі вывучалі гісторыю, геаграфію і прыроду Расіі.

Вялікай падзеяй культурнага жыцця Расіі стала адкрыццё ў 1755 г. Маскоўскага ўніверсітэта. Выкладанне ў ім вялося на рускай мове. Адным з выбітных рускіх вучоных стаў Міхаіл Васільевіч Ламаносаў.



Міхаіл Ламаносаў. Прыжыццёвая выява. 1757 г.

***Міхаіл Ламаносаў*** (1711–1765) прыйшоў з рыбным абозам з далёкай паўночнай вёскі ў Маскву, каб вучыцца. Яму было тады 19 гадоў. Ламаносаў паступіў у Славяна-грэка-лацінскую акадэмію, дзе побач з ім за партай сядзелі дзеці 13–14-гадовага ўзросту. За сваё жыццё ён паспеў здзейсніць вельмі шмат адкрыццяў у розных галінах ведаў. Стаў стваральнікам новай навукі — фізічнай хіміі. Арганізаваў першую ў краіне хімічную лабараторыю. Першым высветліў электрычнае паходжанне паўночнага ззяння. Адкрыў атмасферу на планеце Венера. Апроч таго, ён рэфармаваў рускае вершаскладанне, сам пісаў вершы, а таксама быў аўтарам прац па гісторыі Расіі.

*З якім вядомым дзеячам эпохі Адраджэння можна параўнаць Міхаіла Ламаносава? Патлумачце, чаму.*

**5. Архітэктура.** Значныя дасягненні праявіліся і ў архітэктуры.



Храм Васіля Блажэннага ў Маскве. 1555–1561 гг.

У гонар узяцця горада Казані і перамогі над Казанскім ханствам быў пабудаваны храм Васіля Блажэннага (Пакроўскі сабор). Галоўная ідэя кампазіцыі — аб’яднанне вакол Масквы розных зямель.

У XVII ст. дасягнула росквіту драўляная архітэктура. Яе вылучалі зграбнасць і хараство, багатае дэкаратыўнае аздабленне фасаду — «дзівосная ўзорыстасць». Пад кіраўніцтвам італьянца Барталамеа Растрэлі на набярэжнай Нявы быў пабудаваны шэдэўр рускай архітэктуры— Зімні палац (цяпер Эрмітаж).

Творы геніяльнага дойліда XVIII ст. Васіля Бажэнава звязаныя з Масквой. Сын небагатага царкоўнага служкі, ён праявіў незвычайныя здольнасці да малявання, здолеў скончыць Акадэмію мастацтваў і працягнуць навучанне ў Францыі і Італіі. Ім створаны будынак, які і цяпер заварожвае погляды, — Дом Пашкова (зараз належыць Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы).



Зімні палац у Санкт-Пецярбургу. 1754–1762 гг.



Дом Пашкова ў Маскве. 1784–1786 гг.

```mermaid
graph TD
  A[Архітэктурныя стылі] --> B[Шатровы]
  A --> C[Барока]
  A --> D[Класіцызм]
  B --> E[XVI ст.]
  C --> F[XVII — сярэдзіна XVIII ст.]
  D --> G[Другая палова XVIII ст.]
```

Развіццё архітэктурных стыляў у Расіі

*Вызначце, да якога стылю адносяцца прадстаўленыя на ілюстрацыях архітэктурныя помнікі. Назавіце характэрныя рысы кожнага стылю. Патлумачце, чаму барока і класіцызм пачалі пранікаць у Расію ў XVIII ст.*

**6. Выяўленчае мастацтва і тэатр.** У выяўленчым мастацтве ў XVI—XVII стст. па-ранейшаму панаваў рэлігійны жывапіс — іканапіс. Апошнім вялікім іканапісцам дапятроўскай Русі быў Сімон Ушакоў. У рэлігійных творах ён намагаўся адлюстроўваць «жыўства» — жывыя чалавечыя рысы.

Новаю з'явай у рускім мастацтве XVII ст. зрабіліся партрэты, або, як іх тады называлі, парсуны (ад слова «персона»). Ствараючы парсуны, мастак звяртаўся да звыклых для яго прыёмаў іканапісу, але намагаўся паказаць жывога чалавека. Небывалага ўздыму рускі партрэтны жывапіс дасягнуў у XVIII ст.



Тройца Старазапаветная.
Мастак *Сімон Ушакоў*. 1671 г.

*Як вы мяркуеце, творчасць якога рускага іканапісца сталася ўзорам для Сімона Ушакова? Што, на ваш погляд, новага дадаў Ушакоў у жывапіс?*



Партрэт Кацярыны II. Мастак *Фёдар Рокатаў*. 1763 г.



Партрэт Марыі Лапухіной. Мастак *Уладзімір Баравікоўскі*. 1797 г.



Дзяўчына ў какошніку. Мастак *Іван Аргуноў*. 1784 г.

*Параўнайце парсуны XVII ст. з партрэтамі XVIII ст. Якія новыя рысы набыў партрэтны жывапіс XVIII ст.?*

У Расіі да пачатку XVIII ст. не было агульнадаступнага тэатра. Стварэнне першага прафесійнага публічнага тэатра ў Санкт-Пецярбургу звязанае з імем купецкага сына Фёдара Волкава, якога называюць «айцом рускага тэатра». У гэты ж час вяльможы і багатыя памешчыкі ладзілі свае прыватныя тэатры, набіраючы ў трупы адораных прыгонных. Так узнік прыгонны тэатр.

**7. Змены ў побыце.** Пра тое, як жылі людзі ў XVI ст., можна даведацца з кнігі таго часу пад назвай «Дамастрой». У ёй даваліся парады наконт вядзення дома і гаспадаркі, «як жыць праваслаўным у міры з жонкамі і дзецьмі», як паводзіць сябе ў гасцях.

Побыт сялян і пасадскіх людзей істотна адрозніваўся ад побыту знатных і багатых пластоў рускага грамадства. Для жылля знатных і заможных людзей будаваліся прасторныя дамы — «харомы» са шматлікімі памяшканнямі. З другой паловы XVII ст. у Маскве і іншых гарадах пачалі з'яўляцца каменныя двух- і нават трохпавярховыя дамы.



Баярскія харомы



Хворы муж.
Мастак *Васіль Максімаў*. 1881 г.

*Апішыце жытло баярына. У чым вы бачыце асноўныя адрозненні побыту сялян ад побыту баяр?*

*З дапамогай ілюстрацыі апішыце сялянскае жытло. Для больш поўнай характарыстыкі побыту сялян выкарыстайце дадатковыя крыніцы інфармацыі.*

У XVIII ст. у бытавым укладзе адбыліся істотныя змены. Асабліва важным было ўвядзенне новага календара. З 1700 г. Новы год стаў пачынацца 1 студзеня (замест 1 верасня). Новае летазлічэнне цяпер вялося «ад нараджэння Хрыстова» — гэта значыць так, як ужо было прынята ва ўсіх еўрапейскіх краінах, а не «ад стварэння свету».

Для дваранства і вярхоў гарадскога насельніцтва ўводзіліся новыя формы стасункаў — асамблеі (грамадскія сходы). Яны ладзіліся ў зімовы час па чарзе ў знатных асоб. Тут танцавалі, вялі гутаркі, гулялі ў шашкі, у шахматы. Пры пераемніках Пятра I асамблеі ператварыліся ў балі.

*Такім чынам, у развіцці рускай культуры XVI—XVIII стст. можна вылучыць два вялікія перыяды, раздзеленыя эпохаю праўлення Пятра Вялікага. У дапятроўскі перыяд руская культура развівалася галоўным чынам на*

*ўласнай аснове і была блізкая і зразумелая самым шырокім колам насельніцтва. У пасляпятроўскі перыяд яна зазнала істотны ўплыў заходнееўрапейскай культуры.*

***Ключавыя словы:*** *Іван Фёдараў, кнігадрукаванне, Міхаіл Васільевіч Ламаносаў, парсуна, «Дамастрой».*

**Пытанні і заданні**

**1.** Запоўніце табліцу «Дасягненні рускай культуры XVI–XVIII стст.».

| Асноўныя кірункі культуры | XVI ст. | XVII ст. | XVIII ст. |
|---|---|---|---|
| Пісьменнасць і адукацыя | Пачатак кнігадрукавання ў Расіі (Іван Фёдараў, Пётр Мсціславец) | | |
| Літаратура | | | |
| Архітэктура | | | |
| Жывапіс і іншыя віды мастацтва | | | |

**2.** Якія з дасягненняў рускай культуры XVI–XVIII стст. вы лічыце самымі значнымі? Патлумачце, чаму.

**3.** Пералічыце новыя для Расіі архітэктурныя стылі, што ўзніклі ў XVI–XVIII стст. Якія адметныя рысы стылю дазваляюць вызначыць час узвядзення будынка? Прывядзіце прыклады архітэктурных помнікаў для кожнага стылю. Складзіце табліцу па архітэктурных стылях у Расіі XVI–XVIII стст.

**4.** Як вы лічыце, у жыцці якіх саслоўяў у XVI–XVIII стст. адбыліся найбольш істотныя змены? Патлумачце свой пункт погляду.

**5.** Падрыхтуйце паведамленне пра аднаго з дзеячаў культуры XVI–XVIII стст.

## Абагульняльныя пытанні і заданні да раздзела III

1. Стварыце ментальную карту «Правіцелі Расіі ў XVI–XVIII стст.» (гл. памятку 4 на с. 221).
2. Дайце характарыстыку гістарычным дзеячам: Барысу Гадунову, Емяльяну Пугачову, Аляксандру Меншыкаву (гл. памятку 1 на с. 221).
3. Чаму ў XVI ст. адну з галоўных знешнепалітычных задач Расія бачыла ў выхадзе да Балтыйскага мора? Чым, на вашу думку, тлумачацца поспехі і няўдачы ў знешняй палітыцы падчас кіравання Івана IV?
4. Смутай або Смутным часам гісторыкі называюць пачатак XVII ст., калі Расію ахапіў глыбокі грамадскі крызіс. Яны па-рознаму тлумачаць прычыны Смуты: дынастычны крызіс, незаконнасць кіравання Барыса Гадунова і інш. Якія прычыны Смуты назвалі б вы?
5. Чаму ні Барыс Гадуноў, ні абодва Ілжэдзмітрыі, ні Васіль Шуйскі, нягледзячы на падтрымку шматлікіх прыхільнікаў, не здолелі ўмацаваць сваю ўладу, тады як абранне Міхаіла Фёдаравіча Раманава ўмацавала ўладу і паклала канец Смуце?
6. Ахарактарызуйце рэформы Івана IV, Пятра I, Кацярыны II па наступным плане: а) прычыны; б) асноўны змест; в) вынікі.
7. Вызначце тэрытарыяльныя змены, якія адбыліся ў Расіі ў XVII ст., з дапамогай карты ў атласе.
8. Складзіце схему «Асноўныя кірункі знешняй палітыкі Расіі ў канцы XVII — пачатку XVIII ст.». Ці быў знешнепалітычны курс Расіі працягам яе дзейнасці ў папярэднюю эпоху (напрыклад, у XVI ст.)? Аргументуйце свой адказ.
9. Якія новыя рысы рускай культуры, што з'явіліся ў XVII ст., атрымалі сваё развіццё ў культуры XVIII ст.? Назавіце новыя кірункі ў культуры XVIII ст.
10. Стварыце партрэтную галерэю выбітных расійскіх дзеячаў XVI–XVIII стст., выкарыстоўваючы матэрыялы віртуальных музеяў. Звярніце ўвагу на тое, як іх адлюстроўвалі розныя мастакі. Якім чынам перадаваліся асабістыя якасці гэтых дзеячаў?